# "В Берестии... постави же и церковь святого Петра"

**На падставе гістарычных дакументаў і выяўленых артэфактаў упершыню звернута ўвага на тое, што некаторыя вежы Берасцейскага замка маглі выконваць ролю сакральных збудаванняў. Першы і адзіны раз Галіцка-Валынскі летапіс звяртае наш погляд на існаванне ў Берасці царквы Св. Пятра, пабудаванай рускім валынскім князем Уладзімірам Васількавічам: «В Бєрєстіи жє създа стлъпь каменъ, высотою яко и камєнєцькый; постави же и цєрковъ святого Пєтра, и єуангєліє да опракосъ оковано срєбромъ, и служєбныє съсуды скованы срєбрєны, и кадилница срєбрєна, и крєстъ въздвизалный туто положи; и инаа многаа добродѣяніа съдѣа въ животѣ своємъ, яжє словуть по всѣмъ зємлямъ. Туто жє положимъ конєць Володимєрову княжєнію».**

На вялікі жаль, ні Галіцка-Валынскі летапіс, ні іншыя гістарычныя крыніцы больш аб царкве Св. Пятра ў Берасці не згадваюць. Але прыведзеная вышэй ёмкая фраза, якая адносіцца да другой паловы XIII ст., не дае супакою навукоўцам.



Галіцка-Валынскі летапіс.
Вокладка сучаснага выдання

На самой справе, не мог жа старажытны хранограф прыдумаць царкву, якой не існавала?

Хутчэй за ўсё, замкавую царкву Св. Пятра менавіта князь Уладзімір пабудаваў таксама і ў Кобрыне, сваім горадзе, які разам з землямі ў 1287 г. перадаў сваёй граматай жонцы, княгіне Вользе Раманаўне: *«Сє азъ князь Володимєрь, сынъ Василковъ, внук Романовъ, пишю грамоту: далъ сємь княгини своєй, по своємь животѣ, городъ свои Кобрынъ, и з людми и съ данью, якъ при мнѣ даяли, тако и по мнѣ имать дати княгини моси».*

Праўда, пра саму замкавую царкву Св. Пятра ў Кобрынскім замку гаворыцца ў больш познім дакуменце «Рэвізіі Кобрынскай эканоміі», якую склаў каралеўскі рэвізор Дзмітрый Сапега ў 1563 г., дзе справа тычыцца валок «мѣста Кобринского»: *«(84) На церковь замковую Петровскую ... (1) моркг – (25) прутов – (3) моркга – вольные...».* Таму будаўніцтва замкавай царквы Св. Пятра для князя Уладзіміра Васількавіча хутчэй за ўсё магло быць не выпадковасцю, а, можа нават, і нейкай традыцыяй.

Найбольш грунтоўную інфармацыю



Берасцейскі замак на гравюры Пуфендорфа; стрэлка паказвае на вежу, магчыма камянецкую

пра тое, якімі маглі быць храмы-ратонды на Валыні ў X – першай палове XIV ст., надае нам, безумоўна, цікавая і бездакорная манаграфія Юрыя Дыбы «Українскія храмы-ратонды X – першай паловы XIV стст.». Аўтар манаграфіі, грунтуючыся на архітэктурна-кампазіцыйным аналізе 14 аб'ёмна-прасторавых графічных рэканструкцый храмаў-ратонд Кіеўскай Русі, робіць выснову, што на працягу чатырох стагоддзяў будаўнічыя метады менавіта такога тыпу сакральных збудаванняў не зазналі істотных змен. Што важна для нас, памежныя храмы-ратонды, у тым ліку і валынскія, не пацвярдзілі дапушчэння, што яны рэпрэзентуюць замежныя традыцыі. Другімі словамі, будаўніцтва храмаў-ратонд у раннім Сярэднявеччы – гэта, аказваецца, трывалая мясцовая традыцыя. Важны вынік даследавання.

У гэтым сэнсе цікавасць для заяўленай тэмы выклікае царква-ратонда Васіля Вялікага ва Уладзіміры-Валынскім, якая ўпершыню згадваецца ў 1523 г., але магла быць пабудавана ў канцы XII альбо XIII стст., як і капліца-ратонда Спаса, якую выявілі, заўважым, у верхнім ярусе вежы сяла Стоўп'е, каля валынскага горада Холма, якая была пабудавана ў другой палове XIII ст. альбо ў першай палове XIV ст. Гэта ўсё вельмі добра пасуе да часу будавання Малога замка ў Берасці князем Уладзімірам Васількавічам у другой палове XIII ст., як і Камянецкай вежы ў 1276 г. Пры гэтым абодва названыя вышэй помнікі даўняга дойлідства (маецца на ўвазе царква-ратонда Васіля Вялікага і капліца-ратонда Спаса) захаваліся да сённяшняга дня.

Вельмі важным таксама для нашай тэмы з'яўляецца ў працы Ю. Дыбы і тое, што некаторыя даследаваныя ім цэрквы-ратонды маглі належаць замкам. У першую чаргу, гэта можа адносіцца да царквы-ратонды Архістратыга Міхаіла, якую выявілі ва Уладзіміры на Валыні, і першая згадка пра якую адносіцца да 1268 г. ; а таксама да царквы-ратонды на Замкавай гары Перамышля. Заўважым, гаворка ідзе тут менавіта толькі аб каменных збудаваннях.

Дадамо да гэтага, што вонкавы выгляд старажытных храмаў-ратонд добра вядомы таксама з сярэдневяковай іканаграфіі і са «Сказання аб Барысе і Глебе».

Не паглыбляючыся больш у тэму даследавання Ю. Дыбы, вернемся да некаторых археалагічных вынікаў прафесара П. Ф. Лысенкі ў Берасці. У сваёй навуковай працы «Открытие Берестья» ён паведамляе: «С XIII в. в Берестье начи-



Рысунак з манаграфіі Дыбы – ратонда св. Васілія Вялікага ва Уладзіміры Валынскім

нается монументальное строительство, возводится церковь Св. Петра и башня-донжон. В шурфе в 1972 г. был выявлен развал кладки из крупных валунов на извести в небольшом тонком культурном слое, содержащем предметы XIII в.

В 1987 г. в шурфе на большой глубине найден крупноформатный кирпич-пальчатка, применявшийся в XIII в., и обломок неполивной керамической плитки прямоугольной формы. Подобные плитки применялись для укладки полов в монументальных культовых сооружениях».

П. Ф. Лысенка дасканала ведае аб чым піша яшчэ па археалогіі старажытнага Турава. На жаль, ён дакладна не паведамляе, у якім месцы былі закладзены ім шурфы каля археалагічнага музея «Бярэсце».

Але, як паведаміла асобна дырэктар археалагічнага музея «Бярэсце» С. П. Шчэрба, сам раскоп музейнай *экспазіцыі «Бярэсця» ім не так рэдка* ахвяруе кавалкі цэглы-пальчаткі, якія пад уздзеяннем атмасферных працэсаў час ад часу самастойна выпадаюць з культурнага некранутага слоя, які абрамляе пабудаванні XIII ст. Яшчэ раней П. Ф. Лысенка ў сваёй фундаментальнай працы «Берестье» паведаміў: «Из глины в Берестье изготавливали кирпичи. Они начинают встречаться с XIII в. Очевидно, их производство и использование связано со строительством столпа-донжона. Кирпич имеет размеры 27,5х11, 2х8 см и относится к типу большемерных кирпичей. Из кирпичей такого размера в 1276 г. сложена Каменецкая башня. По всей вероятности, кирпич из Берестья можно также датировать концом XIII в.».

Агляд археалагічнага раскопу музея «Бярэсце» паказаў, што на самой справе з паўднёва-ўсходняга кутка культурнага слоя выглядае старажытная цэгла, сцэментаваная вапнавым растворам, і гэты слой можа адносіцца да канца XIII альбо пачатку XIV стст. Безумоўна, узнікае лагічнае пытанне: Якія старажытныя каменныя пабудовы маглі знаходзіцца з паўднёвай стараны будынка музея "Бярэсце"? Прывядзенне да аднаго маштабу розных планаў Берасця і сумяшчэнне іх са здымкам з космасу дае цікавы вынік. Сапраўды, як выцякае з добра вядомага плана Э. Дальберга 1657 г., на якім пазначаны круглымі значкамі пяць вежаў Берасцейскага замка, менавіта дзве з іх маглі знаходзіцца па-за паўднёвай сцяной сучаснага будынка музея. І такія супадзенні чыстай выпадковасцю назваць цяжка.

Яшчэ раз звернемся да раскопак старажытнага Берасця. Як паведамляе П. Ф. Лысенка: «После завершения раскопа 1975 г. были начаты работы на новом *участке, примыкающем к раскопу 1974 г.* с восточной стороны. Здесь также продолжала вскрываться северная улица, но в раскопе 1976 г. она отклонилась к югу, навстречу центральной улице, с которой



У раскопе археалагічнага музея Берасце, пабудовы 13 стагоддзя

она, возможно, и сливалась за пределами раскопа. Мы выяснили, что вдоль её северной стороны уже после того, как улица перестала существовать, был установлен мощный частокол из толстых (до 40 см) дубовых плах, образующих сплошную стену. Плахи в сечении имели Т-образную форму. Нижними концами они были вкопаны в землю и прорезали первый и второй ярусы уличной мостовой. Подобный частокол был вскрыт и в более ранних пластах, где он вплотную примыкал с северной стороны к третьему ярусу уличной мостовой. За частоколом располагались остатки какой-то постройки, рубленной в «простой угол» из толстых (около 40 см) сосновых брёвен (вскрыт только угол). Сочетание мощного частокола и мощной постройки наводит на мысль, что это были остатки какого-то внутреннего оборонительного сооружения, может



Культурны слой 13 ст. са старажытнай цэглай у раскопе археалагічнага музея Берасце



Цэгла-пальчатка з раскопа археалагічнага музея Берасце



Агульны выгляд археалагічнана музея Берасце
і месца лакалізацыі Берасцейскага замка на здымку Google

быть, башни-донжона. В этом же направлении заметно вспучивается культурный слой, как будто подымаясь на склон возвышенности, на которой могла быть возведена башня. Восточный участок северной улицы также круто поднимается на эту возвышенность. Однако и возвышенность и башня остались за пределами раскопа».

Не будзем спяшацца з вывадамі



Частакол, хутчэй за ўсё Малога
замка 13 ст. фатаграфія П. Ф. Лысенкі

і ўспомнім яшчэ аб адным археалагічным выпадку ў Берасці, які адбыўся ў 1938 г. Размова ідзе пра раскопкі Берасцейскага замка польскім падпалкоўнікам Т. Жуком-Рыбіцкім:

«… Другое, што сустрэлі ў гэтым раскопе, быў шэраг замшэлых свай, якія тырчалі ў вале, цягнуліся ад яго сярэдзіны да дарогі [уздоўж Мухаўца] і тут паварочвалі ўздоўж яе. Сваі даходзілі да сцяны [раскапанага эскарпа бастыёна]… Па абодва бакі сцяны ў тоўшчы вала на глыбіні каля 2 м пад узроўнем дарогі натрапілі на драўляныя часткі ў выглядзе крыжоў… Інжынер Гучэзвін выказаў меркаванне, што гэта могуць быць драўляныя канструкцыі ў аснаванні вала для яго ўмацавання і паходзяць яны самае позняе з XIV ст.».

Складваецца грунтоўнае ўражанне, што і ад захаду (П. Ф. Лысенка), і ад



Частакол, хутчэй за ўсё Малога замка 13 ст. фатаграфія П. Ф. Лысенкі




Частакол, хутчэй за ўсё Малога замка 13 ст. фатаграфія П. Ф. Лысенкі

поўначы (Т. Жук-Рыбіцкі) у Берасцейскім замку было адгароджана драўляным частаколам нешта больш старадаўняе, што магло адносіцца да XIII–XIV стст.

Адказ на гэтае пытанне знаходзім у «Рэестры замка Берасцейскага» 1566 г.: «Вкрут того будованя верхнего ест бляшковане, на которое з долу сходовъ три, кгонтами побитии. На доле в стене жадного будованя, вишнему подобного нет, одно коморъ посполитых с засчипками и без защепокъ всих ест в личбе 75, межи которими за малимъ замком в правой руке оброни, у пяти коморъ двери з ланцухами, а в одное замокъ нутрний…».

Вось яно што аказваецца, у старажытным Берасці існаваў яшчэ Малы альбо Верхні замак, аб чым ужо раней паведамлялася, пры гэтым яго дамінантай, хутчэй за ўсё, з'яўлялася, менавіта, «другая вежа од Мухавца на всходъ сонца» альбо «вежа старая обваленная ново направена». А гэта, і верагодна, і лагічна, што і ёсць тая самая вежа «яко и каменецькая», якую пабудаваў у другой палове XIII ст. валынскі князь Уладзімір Васількавіч. Але ён пабудаваў не толькі вежу, а яшчэ, заўважым, не зрубіў, а «постави же и церковъ святого Петра».

Нават кароткі погляд на план Э. Дальберга 1657 г. пераконвае, што дубовы частакол, які выявіў П. Ф. Лысенка, мог ахопліваць не адну, а, прынамсі, дзве вежы Берасцейскага Малога замка. Тады самы раз звярнуць увагу ў «Рэестры замку Берасцейскага» 1566 г. на вежу «третея одъ Замуховеча наполъ до полудне». Гэта як раз, менавіта, яна магла належаць да Малога замка. Там жа, у рэестры, знаходзім яе апісанне: «За тим будованіомъ, мияючи вежу третую от Мухавца и до другое вежи комор 18;

**Описаніе староства Берестейскаго.**

1566 года.

Загаловак апісання Берасцейскага староства 1566 г.

В тиле тоей полате над Бугомъ.

| | Садибн. прути. | Огороди. прути. | |
|---|---|---|---|
| Попъ Петровски . . . . | 2½ | — | Сераоникъ . . . . |
| Сараевъ. . . . . . . . . | ½ | — | [illegible] |

Поп Пятроўскі ў апісанні з 1566 г.

в коморе, которая ест на вежи, – ланцухъ и всходъ, в стене ест сенка и светлочка, оболона 1, печъ, лави, з светлочки комора, в ней оболон 2, з сенки комора, двери все з засчинками. От вежи, которая ест от Замухавечча, до другой вежи подле кгмаховъ новихъ от Буга ест коморъ 19, у двох ланцухи и комора пот тою вежою з ланцухомъ».

Нельга не заўважыць, што рэвізор звярнуў на «вежу третую от Мухавца» альбо «которая ест от Замухавечча» незвычайную ўвагу і аставіў апісанне яе ўнутранай планіроўкі, чаго нельга сказаць аб «другой вежы ад Мухавца на всходъ сонца» альбо аб «четвертай от Буга на полудне», як і аб «пятай над броною старою зъ кганкомъ на верху, на которой на верху звонъ великий з Вол[ы]ни привезенихъ».

Звернем таксама сваю ўвагу і мы на гэтую вежу, апісанне ўнутранай планіроўкі якой задае шмат пытанняў: «Напрыклад, для чаго ў сцяне гэтай абарончай вежы (хутчэй за ўсё каменнай) спатрэбілася «светлочка», у якой акно, печ, лавы? Якая роля была адведзена каморы з двума вокнамі? І г. д.». Але пытанні пытаннямі, а нейкага важнага аргумента ўсёроўна не хапае, каб прадоўжыць разважанні ў выбраным напрамку.

І зусім нечакана гэты важкі аргумент знайшоўся ў тым жа «Описаніи староства Берестейскаго» 1566 г. на старонцы 209: «В тиле тоей полате надъ Бугомъ… Попъ Петровски – 2 ½ сидибн. прути». Далей бачым: «Куриянъ, попъ; Данило, попъ; Семенъ, попъ; але попъ Воскресенской; попъ Михалувски; попъ Спаски; попъ Песоцки; попъ Пожежински…». Гэта можа азначаць тое, што рэвізор святароў у адным выпадку запісваў па імені, а ў другім – па прыналежнасці да царквы, таму што ў 1566 г. і Васкрэсенская, і Пясоцкая, і Спаская, і Міхалувская … цэрквы ў Берасці існавалі.

Тады пытанне: «Поп Пятроўскі ў Берасці ў 1566 г. пражываў, пры гэтым заўважым, каля Буга, на тэрыторыі, якая належала замку, а царквы Пятроўскай не існавала?». Неяк зусім нелагічна выглядае такі вывад. А калі ўспомніць, што царкву Св. Пятра ў другой палове XIII ст. пабудаваў, менавіта, князь Уладзімір Васількавіч, як, верагодна, і адбудаваў Малы замак у Берасці, то іншай вежы, як «третея одъ Замуховеча напол до полудне» знайсці для такой ролі, як замкавая царква, у Берасці проста не ўдаецца.

Каб замацавацца з такой прапановай, яшчэ раз звернемся да даследавання Ю. Дыбы, які звяртае ўвагу на двух'яруснасць некаторых ратонд, як характэрны прызнак замкавай царквы. Так, ён паведамляе: «Яны [замкавыя царквы-ратонды] складаюцца з дзвюх капліц, размешчаных адна над адною (напрыклад, капліца Сент-Шапель у Парыжы, 1246–1248 гг.). Верхняя капліца была прызначана для ўладара, яго сям'і і вышэйшых саноўнікаў, а ніжняя – для прыдворных ніжэйшага рангу. Трэба таксама зазначыць, што і Вроцлаўскую ратонду Я. Малаховіч лічыў замкавай капліцай [на гэта паказвае невялікае пашырэнне фундамента з усходняй стараны]. Размяшчэнні ў Кіеўскай ратонды



**Койданава каля Мінска, кальвініцкі збор. Здымак невядомага аўтара пачатку XX ст.**

таксама сведчаць, што гэта была замкавая царква».

А цяпер вернемся яшчэ раз да размяшчэння памяшканняў у вежы «третей одъ Замуховеча наполъ до полудне» Берасцейскага замка: «...в стене ест сенка и светлочка, оболона 1, печъ, лави, з светлочки комора, в ней оболон 2, з сенки комора, двери все з засчинками».

Усе характэрныя прызнакі двух памяшканняў-капліц, хутчэй за ўсё, размешчаных адно над другім у цеснай вежы, што можа з'яўляцца грунтоўным дапушчэннем аб існаванні ў Берасцейскай старажытнай фартэцыі замкавай царквы. Канчатковы вынік на гэты конт можа даць толькі археалогія.

Каб закончыць тэму, патрэбна назваць яшчэ адну вежу Берасцейскага замка, якая ў рэестры ідзе першай: «На одной зекгаръ одъ места, который завжди бъетъ». Гэтая вежа ў замку з гадзіннікам была ўзведзена апошняй, і пабудаваў яе ў сярэдзіне XVI ст. берасцейскі стараста Мікалай Радзівіл Чорны, аб чым сведчыць запіс у доўгім пераліку яго рэгалій пад ягоным партрэтам у фундаментальным выданні «Радзівілы: альбом партрэтаў XVIII–XIX стагоддзяў "Icones Familiae Ducalis Radivilianae"», дзе на 66-м развароце альбома значыцца: «... **Arcis Bresten. Restaurator...**", што гучыць у перакладзе з латыні, як **"рэстаўратар твердзі брэсцкай"**».

Будаўніцтва «зекгаравай» вежы ў Берасцейскім замку падтрымлівае і «Рэестр...» 1566 г.: «Повђнност тихъ конюховъ: ... вежу одну замку Берестейского в пят стаенъ замковыхъ будовати повинни». Але ўзнікае лагічнае пытанне: «Для чаго было ў замку будаваць новую вежу, калі поспехі ў развіцці артылерыі

поўнасцю ў XVI ст. прымусілі Еўропу перайсці на бастыённую сістэму абароны?» Зразумелага адказу на гэтае пытанне не маецца. Але будаўніцтва ў Берасцейскім замку Мікалаем Радзівілам Чорным зекгаравай вежы з гадзіннікам, заўважым, першым на тэрыторыі сучаснай Беларусі, становіцца зразумелым і лагічным, калі прыпамятаць, што менавіта Мікалай Радзівіл, ваявода віленскі, заснаваў тут, у Берасці, кальвіністкі збор, першы на Беларусі, які яшчэ доўга існаваў пасля яго.

А цяпер задумаемся і запытаемся, як мог першы і адзін з галоўных цэнтраў кальвінізму ў ВКЛ заставацца без сімвала? Гэта, па-першае. А па-другое, ці магла самая высокая вежа ў замку ды яшчэ з гадзіннікам, справай вельмі рэдкай для таго часу, такую ролю выконваць? Больш «так», чым «не».

І для такой перавагі погляду маюцца абставіны. Прачытаем уважліва апісанне вежы з гадзіннікам: «С тоей вежи под вежою зикгаровою естъ комора, в ней оболонъ три немалыхъ, у дверей замокъ нутрний з блямкою, за тою коморою на вежи есть коморок три, з них у двух коморки потребние». Для чаго ў абарончай вежы такі камфорт і, галоўнае, тры вокны немалыя? А гадзіннік на вежы для чаго, каб непрыяцелю лепш было цэліцца? Нешта зашмат яўна неабарончых абставін мела тая вежа.

Да не толькі абарончага прызначэння зекгаравай вежы ў Берасцейскім замку скланяе і тое, што такія прыклады, як гадзіннік на вежы, мела, напрыклад, царква евангелістаў у Каралеўцу, і не толькі. Але самае цікавае, што такі сімвал, як гадзіннік на вежы, існаваў на зусім блізкім для нас кальвінісцкім зборы ў Кайданаве (сёння Дзяржынск), узведзеным тымі ж Радзівіламі.

Зразумела, каб гэты вывад стаў канчатковым, а вынік матэрыялізаваным, – пошукі патрабуецца прадоўжыць.

Але зекгаравую вежу ў Берасці чакаў, на жаль, іншы лёс: «1619 ...Того же року септемврія 11 буря була барзо великая, іже все дерево по садах поломила і вежу замковую в Бересті з годинником у воду вкинула і двур Сопіжин стерла».

**Анатоль Гладышчук**
(г. Брэст, Беларусь)

1. Галицко-Волынская летопись. По Хлебниковскому списку. Текст, комментарий, исследование. СПб, 2005. 422 с.

2. Там же.

3. Ревизия Кобринской экономии, составленная в 1563 году королевским ревизором Дмитрием Сапегою. Вильна, 1876. С. 27.

4. Диба Ю. Р. Українські храми-ротонди X – першої половини XIV століть. Львів, 2005. 106 с.

5. Там само. С. 6.

6. Гладыщук А. А. Берестейский замок – древнейшая фортеция Беларуси // Первая мировая война на Беларуси : сборник докладов II международной научно-практической конференции. Брест, 2013. С. 46–53.

7. Диба Ю. Р. Зазнач. твор. С. 16.

8. Там само. С. 23–24.

9. Лысенко П. Ф. Открытие Берестья. Минск, 2007. С. 163–164.

10. Лысенко П. Ф. Города Туровской земли. Минск, 1974. С. 62.

11. Лысенко П. Ф. Берестье. Минск, 1985. С. 335.

12. Лысенко П. Ф. Открытие Берестья. С. 63–64.

13. Піваварчык С. А. Невядомыя раскопкі Брэста ў 1938 годзе // Гістарычна-археалагічны зборнік. Мінск, 1999. № 14. С. 173.

14. Описаніе староства Берестейскаго // Документы Московского архива Министерства юстиции. М., 1897. Т. 1. С. 443.

15. Гладыщук А. А. Пазнач. твор. С. 48–49.

16. Описаніе староства Берестейскаго. С. 444.

17. Там же. С. 443.

18. Лысенко П. Ф. Открытие Берестья. С. 64.

19. Описаніе староства Берестейскаго. С. 444.

20. Там же. С. 442–443.

21. Там же. С. 444.

22. Описаніе староства Берестейскаго. С. 209.

23. Там же.

24. Диба Ю. Р. Зазнач. твор. С. 67.

25. Описаніе староства Берестейскаго. С. 442.

26. Там же. С. 292.

27. Радзівілы : альбом партрэтаў XVIII–XIX стагоддзяў «Icones Familiae Ducalis Radivilianae». Мінск, 2010. Разварот 66.

28. Описаніе староства Берестейскаго. С. 253.

29. Малоизвестные летописные памятники // Исторический архив. М. ; Л., 1951. Т. VII. 4 : Острожский летописец.

30. Там же.

Artykuł Anatola Hładyszczuka o XIII-wiecznej cerkwi św. Piotra na brzeskim zamku, na łamach naszego pisma inauguruje jubileusz 1000-lecia pierwszej wzmianki o Brześciu. W 1017 r. Latopis Nowogrodzki informuje o pochodzie kniazia Jarosława na „Berestie". Chociaż bardziej rozpowszechniona jest inna data pierwszej wzmianki - 1019 r., jednakże w roku 2017 r. powinniśmy właśnie ten jubileusz obchodzić.

Anatol Hładyszczuk, profesor Uniwersytetu Technicznego w Brześciu jest niekwestionowanym autorytetem w badaniach najstarszych dziejów nadbużańskiej stolicy, autorem nieopublikowanego jeszcze obszernego dzieła o brzeskim zamku. W następnym numerze „Bielskiego Hostinca" przedstawimy artykuł uczonego o, działającej w latach 1665-1666, brzeskiej mennicy, w której wybito miliony boratynek.